## ХЛЕБ — УСЯМУ ГАЛАВА



У час сняданку ў школьнай сталовай Васілінка заўважыла лустачку хлеба на падлозе.

— Лянок, глядзі, у некага хлеб упаў, — гукнула дзяўчынка сябра.

— Трэба хуценька падняць, каб хто не наступіў, — сказаў Лянок і пацягнуўся за лустачкай.

— Малайчына, Лянок, — сказала Васілінка. — Толькі я не разумею, чаму лустачку не падняў той, у каго яна ўпала?

Адкажыце на пытанне Васілінкі.

Дамо́вімся — *рус.*: договоримся.
Кро́іць — *тут*: разразаць.

Правообладатель Национальный институт образования

Паслухайце пачатак твора і скажыце, якая стра́ва, па-вашаму, самая галоўная.

# Хлеб

*Леанід Улашчанка*

Была нядзеля. Гаспадыня накрыла святочны стол. Чаго толькі на ім не было: і грэцкая каша, і сала́та, і сма́жанае мяса, і нават фар-шы-ра-ва́-ны шчупа́к. Усе стравы атрымаліся вельмі смачныя. Але не паспела гаспадыня выйсці, як яны за-спра-ча́-лі-ся паміж сабою, якая з іх самая галоўная.

Кожная была ўпэўнена, што яна найважнейшая. Як тут быць? «А давайце дамовімся, — пра-па-на-ва́-лі раптам агуркі, — каго першага людзі возьмуць у рукі, той і галоўны». На тым і пагадзі́ліся.



Гаспадыня запрасіла гасцей да стала. Калі́ ўсе паселі, самы стары і паважа́ны дзед агле́дзеў стол і запыта́ўся, ці ў кожнага ўсё ёсць.


Правообладатель Национальный институт образования

Потым яшчэ раз зірнуў на стол і хі-тра-ва-та ўсміхнуўся:

— Гаспадынька, а нешта ж я не бачу на сталe самага галоўнага…

— Чаго? — падхапíлася гаспадыня.

— Паглядзí, сама ўбачыш…

Жанчына акíнула ўважлівым вокам стол і пля́снула далонямі:

— Гэта ж трэба — хлеб не падала́! Так за-кру-ці-ла-ся, што пра самае галоўнае забылася.

Людзі за сталом заў-смі-ха-лі-ся, па-ве-ся-ле-лі, а гаспадыня прынесла вялікі бохан свежага духмянага хлеба і падала дзеду. Той узяў нож і пачаў лусту за лустай кроіць яго. Рукі гасцей самі сабой па-ця-гну-лі-ся да хлеба.

Усе стравы сцíхлі.

Хлеб! Ён ніколі не пры-я-да́-е-цца і ніколі не лішні. Ён і ёсць усяму галава.

1. Пра што заспрачаліся стравы? Хто перамог у спрэчцы? Чаму?

Правообладатель Национальный институт образования

2. Прачытайце апошні сказ твора. Чаму так кажуць пра хлеб?
3. Падзяліце твор на тры сэнсавыя часткі. Пра што гаворыцца ў кожнай частцы?
4. Прачытайце па ролях у парах размову гаспадыні з дзедам.



Якія хлебныя вырабы вы любіце? Каму вы ўдзячныя за хлеб?
Паслухайце верш і скажыце, чым пахне хлебная скарынка.

## Хлебная скарынка

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Пахне
Хлебная скарынка
Цёплым ветрыкам,
Хваінкай,
Летнім дожджыкам
Грыбным,
Лугам,
Полем аржаным,
І асенняй пазалотай,
Ды натхнёнаю работай.


Правообладатель Национальный институт образования

1. Які водар адчуў аўтар у хлебнай скарынцы?
2. Пра што трэба памятаць, калі бярэш у рукі хлеб?
3. Які запавет продкаў выказаны ў прыказцы?
   - Калі хочаш хлеб мецi,
     то трэба зямліцы глядзецi.
4. Вывучыце верш на памяць.
5. Разгледзьце карціну Івана Шышкіна «Жыта». Якія словы з верша можна выкарыстаць для яе апісання?





Спакон веку беларусы паважліва ставяцца да хлеба. У адносінах да хлеба трэба выконваць пэўныя правілы. Падумайце якія.

Правообладатель Национальный институт образования